Газета дзяржаўнай установы адукацыі “Грычынскі вучэбна-педагагічныкомплекс яслі-сад –базавая школа”



# Перапынак!



Школа - гэта родны дом,
Дружна тут усе жывём,
Пра падзеі ў школьным свеце
Мы раскажам у газеце!

№4
Снежань, 2020

## Чытайце ў нумары:

Акцыя "Птушкі на кармушцы" стар. 2

Акцыя "Падары дзіцяці радасць" стар. 3

Навагодні кірмаш стар. 4

Вечар у навагоднім кафэ стар.5

Весткі з дзіцячага сада стар. 6

# Акцыя “Птушкі на кармушцы”

Мы зімой пра птушак не забудзем,
Нашых добрых радасных сяброў
Ім кармушкі майстраваць мы будзем,
Каб яны спявалі песні зноў!













# Акцыя “Падары дзіцяці радасць”

Новы год дорыць цуда усім і кожнаму. Адным з цудаў стала наведванне навучэнца нашай ўстановы Гарачкі Яўгена, які асвойвае вучэбную праграму дома. Навучэнцы шостага класа са сваім класным кіраўніком Васіленка Наталляй Віктараўнай дапамаглі Яўгену зрабіць навагодні сувенір. Дзеці чыталі разам вершы, спявалі песні. Але самым прыемным момантам стаў сюрпрыз ад бабулі Галіны Паўлаўны, якая пачаставала ўсіх смачным чаем і салодкімі прысмакамі. Ад гэтага дзеці сталі яшчэ больш вясёлымі і актыўнымі.







Чалавечая дабрыня, міласэрнасць, уменне радавацца і суперажываць іншым людзям складаюць аснову чалавечага шчасця. Каб рабіць дабро, трэба, перш за усё ім валодаць.  І навучэнцы нашай установы,  і педагогі, несумненна, маюць такую якасць. Менавіта гэта і стала прычынай іх актыўнага ўдзелу ў акцыі “У цеплыя рукі”. Былі падрыхтаваны падарункі для дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльных установах .  Менавіта так, невялікімі крокамі, кожны з нас стварае Каляднае цуда для тых, каму яно асабліва патрэбна.



# Навагодні кірмаш




Весяліся, дзятва!
Весяліся, народ!
Колькі ўсюды святла!
Новы год! Новы год!

Што прыносіць Новы год?
Наша школа пераўтварылася ў чароўную казачную краіну вяселля, смеху і радасці. На Кірмашы кожнага чакалі неверагодныя прыгоды, танцы, сюрпрызы і салодкія падарункі ад Дзядулі Мароза і Снягурачкі.











# Вечар у навагоднім кафэ

Пад час мерапрыемства навучэнцы павіншавалі настаўнікаў і сябраў з надыходзячым Новым годам, спявалі разам,танцавалі, чыталі вершы, паказвалі тэатральныя пастаноўкі














# Весткі з дзіцячага сада

І вось наступіла зіма, і нарэшце выпаў доўгачаканы снег. А ў канцы снежня мы весела святкавалі Новы год. Да нас на ёлачку завіталі Дзед Мароз, Снягурачка і нават Кікімара.










